**Баргановіч, Э.** Вечная памяць паўшым! Нізкі паклон жывым! / Э. Багдановіч // Сцяг працы (Міёры). — 2000. — 15 лют. — С. 2.

## ВЕЧНАЯ ПАМЯЦЬ ПАЎШЫМ! НІЗКІ ПАКЛОН ЖЫВЫМ!

Я памятаю дзень пахавання Пятра Брынкевіча, 19-гадовага хлопца, выпускніка Міёрскай СШ № 1. І ў той вясновы дзень, здавалася, плакала, стагнала сама зямля. А якім было зыркім сонца! З'яўлялася першая зеляніна, і ўсё купалася ў веснавой квецені.

Амаль увесь горад ішоў за цынкавай трунай. Кветкі, мора кветак, чорныя стужкі і слёзы. Плакалі ўсе. Як можна?! Праводзілі юнака ў армію, а атрымалі... закрытую цынкавую труну.

А колькі іх, такіх юных хлопчыкаў, чыю кроў праглынула чужая зямля!

Страціўшы сына, у сям'і Брынкевічаў, здавалася, спынілася, замерла ў чорнай жалобе само жыццё. Страчана ўсё, што дагэтуль цешыла, усяляла надзею. А гэта быў 1987 год.

Пётр Брынкевіч нарадзіўся 10 сакавіка 1968 года ў Міёрах.

Закончыў сярэднюю школу № 1 і да прызыву ў армію працаваў у гэтай жа школе лабарантам. 20 мая 1986 года прызваны ў Савецкую Армію, закончыў вучэбнае падраздзяленне і ў кастрычніку накіраваны ў Афганістан. Механік-вадзіцель радавы Пётр Брынкевіч загінуў пры выкананні баявога задання 18 сакавіка 1987 года.

З успамінаў аб Пятру Брынкевічу былога дырэктара школы Т. А. Далговай:

«Увачавідкі бачу стройнага, прыгожага хлопца з пышнай цёмна-русай шавялюрай, адкрытым чэсным поглядам, цёплай сяброўскай усмешкай, вельмі сціпла апранутага ў цёмны касцюм, блакітную кашулю. Такім ён, напэўна, застанецца для мяне заўсёды.

Пётр вучыўся ў нашай школе з 1 па 10 клас. Вучыўся роўна. Прыкладаў нямала намаганняў і стаpанняў, каб авалодаць ведамі па ўсіх прадметах. Больш усяго яму падабаліся фізіка, гісторыя, біялогія. Захапляўся радыётэхнікай. Вучань як вучань. Такіх было ў класе большасць. І разам з тым многае можна расказаць аб ім. Першае, што кідалася ў вочы, – гэта актыўнасць натуры. Актыўнасць і добрасумленнасць, актыўнасць і адказнасць. А таксама гумар: Пётр заўсёды знаходзіў час, каб дапамагчы сябру па вучобе, класнаму кіраўніку, прадметніку ці піянерважатай.

Спраў у школе неўправарот, ён мог быць атрадным важатым, выступаць з цікавай інфармацыяй у класе або на школьным прадметным вечары. Ён прымаў удзел у фотаконкурсах, у аглядзе мастацкай самадзейнасці, праводзіў фіззарадку ў малодшай групе. Ён мог быць добрым і шчодрым Дзедам Марозам на Новы год на ёлцы. Любіў біялогію, лепш іншых мог выканаць і аформіць летняе заданне па гэтаму прадмету і весці запісы назіранняў. Ну а калі вясной ці восенню даводзілася працаваць на прышкольным участку або ў падшэфным калгасе, то ён працаваў да сёмага поту, з душой, выкладваючы ўсяго сябе, з'яўляўся прыкладам для іншых. У турыстычным паходзе быў сяброўскім, знаходлівым, стараўся ва ўсім дапамагчы. Трэба адзначыць, што ён вельмі добра, цнатліва адносіўся да дзяўчынак. У дзесятым класе стаў сябраваць са сваёй аднакласніцай Валяй Івановай, сяброўства ў хуткім часе перарасло ў каханне. Вельмі прыемна і радасна было глядзець на іх, радавацца іх культуры адносін.

Я Пецю не ідэалізую. Ён сапраўды быў добрым. Сціплы, разумны, тактоўны, шчодры душой. Ад яго, як ад чыстай крыніцы, зыходзіла толькі ўсё добрае: добразычлівасць, працалюбства, праўдзівасць, сардэчнасць. У гэтым вялікая заслуга яго бацькоў. Ён быў у іх

адзіным сынам. Павага да бацькоў, суседзяў, павага сябе. У яго галоўным было – рабіць добрае іншым. Пасля заканчэння дзесяці класаў ён меў правы вадзіцеля, атрыманыя ў ВВК. Але стаў працаваць у школе лабарантам кабінета фізікі і вёў фотагурток сярод малодшых школьнікаў.»

Характарыстыка на Пятра Веніямінавіча Брынкевіча, лабаранта сярэдняй школы № 1 г. Міёры:

«Пётр Веніямінавіч Брынкевн знаходзіўся на ўліку ў настаўніцкай камсамольскай арганізацыі СШ № 1 з верасня 1985 года. За час работы зарэкамендаваў сябе добрасумленна адносячымся да даручэнняў камсамольцам, неаднаразова выконваў разавыя грамадскія даручэнні.

Маральна ўстойлівы, палітычна граматны. У адносінах унутры калектыву добразычлівы, чулы, чэсны. Да сваіх непасрэдных абавязкаў адносіцца добрасумленна».

З пісьма Пятра Брынкевіча бацьку 1 студзеня 1987 года:

«Добры дзень, тата! З вялікім прывітаннем да цябе я. Ну, ты не здзіўляйся, што пісьмо пішу менавіта табе. Разумееш, што я пісаў вам раней – гэта няпраўда. Служу я не ў МНР, а ў саставе савецкіх войск абмежаванага кантынгенту ў Дэмакратычнай Рэспубліцы Афганістан. Вядома, калі мама даведаецца аб гэтым, ты сам ведаеш, што будзе. Хаця тут, дзе я служу, месца ціхае. Служу я ў горадзе Шынданд. Разумееш, я цябе не супакойваю, але Афганістан гэта не тое, што ты думаеш. У Афганістане я ўжо з 14 лістапада...»

Пётр Брынкевіч не хацеў турбаваць сваю маці, ведаючы яе нетрывалае здароўе. Пісаць праўду ён стараўся толькі бацьку, лічачы яго больш мужным, а маці ён слаў пісьмы на хатні адрас, у іх паведзмляў, што служба праходзіць нармальна.

На жаль, усё атрымалася інакш. Не збярог здароўе сваёй любай маці Пётр Брынкевіч. І хаця ў адным з перадапошніх пісьмаў Пеця пісаў бацьку, што хутка іх пераводзяць у Саюз, не дачакаўся ён таго дня. Загінуў у росквіце гадоў.

Чорным, злым крылом ударыла пахаванка ў вакно маці. Разрывалася мацярынскае сэрца ад болю і жалю. Не стала яе дарагога сына, яе апоры. У выніку страчана здароўе, страчаны сэнс жыцця.

Заўчасна пайшоў потым з жыцця і бацька Пятра Брынкевіча – Веніямін Пятровіч.

Штогод ушаноўваюць памяць воіна-афганца цяперашнія вучні Міёрскай СШ № 1. Яго імем названа адна з вуліц райцэнтра.

Носіць імя воіна-афганца і яшчэ адна вуліца Міёр, таксама выпускніка Міёрскай СШ № 1 – Сяргея Закрэўскага. Малодшы сяржант Сяргей Закрэўскі нарадзіўся 11 студзеня 1967 года ў Міёрах, загінуў 25 студзеня 1986 года. Пахаваны на гарадскіх могілках. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Малодшы сяржант Уладзімір Мяцеліца нарадзіўся ў вёсцы Яснікова Полацкага раёна. Жыў і вучыўся ў нашым раёне. Загінуў 24 снежня 1987 года. Пахаваны ў вёсцы Чарапы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Малодшы сяржант Сяргей Станкевіч нарадзіўся 20 мая 1964 года ў вёсцы Слабада Туркоўскага сельсавета. Загінуў 10 красавіка 1985 года. Пахаваны ў вёсцы Грыгаравічы, што ў нашым раёне. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Радавы Сяргей Мікалаевіч Шляпаў нарадзіўся 25 чэрвеня 1965 года ў вёсцы Забор’е на Міёршчыне. Загінуў 24 сакавіка 1985 гада. Пахаваны ў вёсцы Іст. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Закончылася дзесяцігадовая, нікім і нікому не аб’яўленая гераічная і трагічная вайна. Але ў памяці людской ёй яшчэ жыць доўга, таму што яе гісторыя напісана крывёй салдат і слязамі маці, абеліскамі з зорачкамі і ўварваўшымся ў наша жыцце франтавым ветрам. Навечна застанецца гэтая вайна ў душах пакалення, выйшаўшага з яе, пакалення, апаленага агнём і засвоіўшага суровыя вайсковыя ўрокі.

**Э. Багдановіч**